✦ да 110–годдзя з дня нараджэння пісьменніка Міхася Лынькова

# Не згасае памяць землякоў



**Недалёка ад станцыі Крынкі, у вёсцы Засыбы, 30 лістапада 1899 года нарадзіўся Міхась Ціханавіч Лынькоў. Наш зямляк добра вядомы не толькі як славуты пісьменнік, аўтар кніг "Міколка–паравоз", "Андрэй Лятун", "Сустрэчы", "Векапомныя дні" і іншых, але і як грамадскі дзеяч, вучоны.**

*Крынки – это станция такая,*
*Маленькая, в зелени садов,*
*Где курьерский, мимо пролетая,*
*Не заметит редких огоньков...*

**Д. Симанович**

На працягу дзесяці гадоў (з 1938 па 1948 год) М. Лынькоў узначальваў Саюз пісьменнікаў БССР. У 1943–1946 і 1949–1952 гадах ён працаваў дырэктарам Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва Акадэміі Навук БССР, членам–карэспандэнтам якой быў абраны ў 1936–ым, акадэмікам – у 1953 годзе. Міхась Лынькоў у складзе дэлегацыі рэспублікі ўдзельнічаў у рабоце канферэнцыі ў Сан–Францыска, на якой была заснавана Арганізацыя Аб'яднаных Нацый. Ён таксама ўдзельнічаў у сесіях Генеральнай Асамблеі ААН у Нью–Йорку ў 1952, 1953, 1954 і 1955 гадах.

Нягледзячы на вялікую занятасць, Міхась Лынькоў не губляў сувязей з Лёзненшчынай, вёў перапіску з вучнямі Крынкаўскай школы. А ў маі 1961 года па запрашэнню настаўнікаў і вучняў гэтай школы ён прыязджаў на крынкаўскую зямлю. З гэтай нагоды ў Крынкі прыехалі і супрацоўнікі нядаўна створанай Віцебскай абласной студыі тэлебачання, а ў іх ліку і былы настаўнік Крынкаўскай школы, паэт Давід Сімановіч. Асобныя моманты сустрэчы з пісьменнікам-земляком былі зняты на кінастужку.

Аб прыездзе на бацькаўшчыну М. Лынькова пісала Лёзненская раённая газета "Ленінскі сцяг" ад 24 мая 1961 года: "...Ля саўгаснага клуба сотні школьнікаў, дарослых. Зала клуба не змагла ўмясціць усіх жадаючых сустрэцца са сваім земляком і прама на вуліцу былі вынесены сталы, крэслы, лаўкі. Любоўна напісаны плакат на сцяне клуба вітаў прыезд пісьменніка. За сталом прэзідыума займаюць месцы Міхась Ціханавіч Лынькоў, яго брат Мікалай Васільевіч Лынькоў, сябра дзяцінства Міхася Ціханавіча пенсіянер Шалаеў і іншыя".

З прывітальнымі словамі выступілі дырэктар школы Сокалаў, выкладчыца беларускай мовы і літаратуры Алёшкіна, ад калектыву рабочых саўгаса – Надзея Купчанка. Потым узяў слова Міхась Лынькоў. Ён падзякаваў за цёплую сустрэчу, расказаў аб сваіх уражаннях ад паездак у ЗША, Індыю. Вучні школы падарылі пісьменніку альбом з фатаграфіямі аб школьным жыцці, шкатулку, чарнільны прыбор, зробленыя сваімі рукамі, а таксама паказалі невялікую інсцэніроўку па аповесці "Міколка-паравоз".

Праз год пасля смерці пісьменніка (21 верасня 1975 года) пастановай Савета Міністраў БССР ад 12 студзеня 1976 года крынкаўскай школе было прысвоена імя М. Ц. Лынькова. Выкладчыца беларускай мовы і літаратуры Лідзія Іосіфаўна Алёшкіна і вучні Крынкаўскай школы шмат папрацавалі над стварэннем музея пісьменніка. Былі сабраны прадметы ўжытку пары ягонага юнацтва, шматлікія дакументы, фотаздымкі, кнігі як самаго пісьменніка, так і Максіма Танка, Ніла Гілевіча, Янкі Брыля, Еўдакіі Лось ды іншых беларускіх пісьменнікаў з аўтографамі.

Урачыстае адкрыццё музея і помніка народнаму пісьменніку адбылося ў суботу 28 кастрычніка 1978 года. На ўрачыстасць прыехалі прадстаўнікі грамадскасці вобласці і раёна, госці з Мінска. Зноў звернемся да публікацыі ў раённай газеце "Сцяг перамогі" ад 2 лістапада 1978 года: "Мітынг кароткім уступным словам адкрыў дырэктар школы А. А. Касянкоў. Пад гукі аркестра спадае пакрывала і погляду прысутных адкрываецца такі знаёмы і такі блізкі твар пісьменніка.

Слова прадастаўляецца сакратару райкома партыі Я. П. Зэльцану. Ён гаворыць аб вялікай значнасці падзеі, аб тым, што на гэтай зямлі свята шануюць памяць славутага земляка, расказвае аб укладзе настаўнікаў і вучняў школы ў стварэнне помніка і музея.

З цікавасцю былі выслуханы выступленні паэта Анатоля Вярцінскага, мастака з Віцебска П. М. Баранава, які некалі быў блізка знаёмы з Міхасём Лыньковым, вучаніцы Алы Салаўёвай, сакратара парткома племзавода "Крынкі" В. І. Салаўёва.

Да помніка вучні і госці ўсклалі жывыя кветкі. Затым, пасля мітынгу, адбылося адкрыццё музея народнага пісьменніка Беларусі М. Ц. Лынькова. Права перарэзаць стужку было дадзена члену дэлегацыі Саюза пісьменнікаў БССР паэту Сяргею Грахоўскаму".

*Вучаніцы школы – Ларыса* Германава, Лена Тамашчук і Наташа Алёшкіна – падрабязна расказалі аб кожным раз*дзеле музея.*

Потым у кабінеце беларускай літаратуры адбылася сустрэча з гасцямі. Перад рабятамі выступілі Сяргей Грахоўскі, Анатоль Вярцінскі, Таіса Бондар, Яўген Каршукоў, Давід Сімановіч, навуковы супрацоўнік інстытута літаратуры імя Янкі Купалы А.Ф. Дзенісенка. Яны прачыталі свае творы, падзяліліся ўспамінамі аб сустрэчах з Міхасём Лыньковым. З вялікай увагай слухалі дзеці выступленне Софіі Захараўны, жонкі Міхася Ціханавіча.

Памяць аб Міхасю Ціханавічу ўдзячныя землякі беражліва захоўваюць і пасёння.

**Алена БОНДАРАВА,**
**вядучы спецыяліст аддзела па архівах і справаводстве галоўнага ўпраўлення юстыцыі Віцебскага аблвыканкама**